

# ВЫПРАБАВАННЕ ВАДОЙ

25 мая з Полацка стартаваў трансгранічны байдарачны дэсант. Яго мэта—прыцягнуць увагу турыстаў з Беларусі і блізкага замежжа да водных маршрутаў у трансгранічным турыстычным рэгіёне "Белла Дзвіна", які ўключае ў сябе Віцебскую вобласць і Латгалію (Латвія). Агульная працягласць маршруту прыкладна 150 км. У туры прымаюць удзел беларускія і латвійскія эксперты праекта, а таксама прадстаўнікі ЕС у Беларусі і журналісты.



*Вецер узняў на Дзвіне хвалі, якія перашкаджалі байдарачнікам плысці хутка. Тым не менш такое выпрабаванне паспяхова пераадольвалася. Уверсе—момант прычальвання ў Дзісне. Злева—Вольга Прохарава—адзін з экспертаў праекта. Па яе словах, каманда гатова да любых нечаканасцяў, а сустрэчы на шляху падарожнікаў радуюць.*

26 мая байдарачнікі ў вечаровы час падплылі да Дзісны. Відовішча захапляючае. На беразе сабралася мноства школьнікаў, мясцовых жыхароў. Усе з нецярпеннем чакалі з'яўлення лодак. Парк на беразе Дзвіны вядомы многім жыхарам Міёршчыны. Яшчэ да вайны гэта было любімае месца адпачынку гараджан. Дзісёнка тут упадае ў Дзвіну. Дарэчы, гаспадары грунтоўна падрыхтаваліся да прыёму гасцей. У парку з'явіліся, як кажуць, новыя малыя архітэктурныя формы. Тут можна зварыць рыбную юшку, устаноўлены мангал, каб падсілкавацца шашлыком.



*Старшыня Дзісенскага гарсавета В. А. Мароз расказвае прыбыўшым гасцям пра гісторыю Дзісны. На гэтым здымку пешая прагулка па парку ля ўзбярэжжа Заходняй Дзвіны.*

А шостай гадзіне па шэрагах сустракаючых пракацілася: "Плывуць!" З-за павароту адна за другой паказваюцца байдаркі. Яны бяруць накірунак да берага. Праз лічаныя хвіліны ўдзельнікі тура прычальваюць, а затым выносяць свае лодкі на бераг. Дзісенцы цёпла вітаюць турыстаў, крычаць "ура". Пачынаецца імправізаваны мітынг. Адзін з экспертаў праекта і яго каардынатар Вольга Прохарава адзначыла, што не чакалі такой масавасці, а калі ўбачылі натоўп сустракаючых, прыбавілася сіл, знікла стома. Шчыра дзякавала за сардэчны прыём.

З прывітальным словам выступіла старшыня Дзісенскага гарсавета Вольга Аляксандраўна Мароз. Яна гаварыла, што самы маленькі гарадок у Беларусі, Дзісна, размешчаны на старажытным водным шляху, якім карысталіся нашы продкі. Гэта своеасаблівы гарадок-маяк, які нельга абмінуць. Прыемна, што рака аб'ядноўвае народы.

Гучыць каманда на пастраенне. Удзельнікі тура ўтвараюць шарэнгу. Затым знаёмства з кожным. Прысутныя маглі задаць цікавячыя пытанні і атрымаць адказы.

Потым Вольга Аляксандраўна запрашае байдарачнікаў на своеасаблівую экскурсію па алеях парка "Восем гістарычных крокаў Дзісны". На дрэвах былі развешаны карціны. Экскурсаводы расказалі пра гісторыю горада. У гэты час на месцы высадкі байдарачнага дэсанта кіпела праца. Мясцовыя школьнікі дапамагалі ўстанаўліваць палаткі.

Экскурсія па гораду. Пасля яе завяршэння байдарачнікі на аўтобусе накіраваліся ў Язна для знаёмства з гэтым населеным пунктам і яго жыхарамі.

Каманда турыстаў-байдарачнікаў у наступныя дні наведала Лявонпаль, перасекла беларуска-латвійскую граніцу і спынілася ў Піедруі. Завяршыўся тур 30 мая ў вёсцы Слуцешкі, дзе на тэрыторыі прыроднага парку праходзіў міжнародны фестываль народных мастацтваў "Аўшдаўгава 2010".

Маршрут "Белла Дзвіна" складзены такім чынам, каб турысты, якія падарожнічаюць на байдарках, маглі знаёміцца з выдатнымі мясцінамі Віцебшчыны і Латгаліі. Ад арганізатараў тура мясцовыя жыхары атрымалі інфармацыйныя буклеты і сувеніры.



*Дзісенцы, у першую чаргу школьнікі, віталі байдарачнікаў крыкамі «ура» і сцяжкамі.*

Л. КАСАТЫ.